КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ 2025

Рэзалюцыя дэмарктычных сілаў Беларусі
да Канферэнцыі Новая Беларусь 2025

# Па пытаннях бяспекі Беларусі

Грунтуючыся на артыкуле 18 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года, дзе замацоўваецца нейтральны статус Рэспублікі Беларусь, якая не імкнецца да ядзернай зброі і не з'яўляецца пагрозай для іншых дзяржаў;

Канстатуючы, што пасля фальсіфікацыі вынікаў выбараў 2020 года рэжым Аляксандра Лукашэнкі страціў як легітымнасць, так і легальнасць, і захоўвае кантроль над тэрыторыяй Беларусі дзякуючы рэпрэсіям, унутранаму тэрору і знешняй падтрымцы з боку Расійскай Федэрацыі;

Прымаючы пад увагу рэзалюцыю "Аб прызнанні інтэрвенцыі Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліку Беларусь і ўсталяванні гібрыднай формы акупацыі", прынятую 26 лютага 2025 года Каардынацыйнай радай III скліканння[1];

Адзначаючы, што з 24 лютага 2022 года Беларусь фактычна страціла палітычную суб'ектнасць і знаходзіцца ў стане гібрыднай акупацыі з боку Расіі, якая выкарыстоўвае тэрыторыю Беларусі для агрэсіі супраць Украіны, Падкрэсліваючы, што ў Беларусі страчаны кантроль над уласнай бяспекай, уключаючы ваенны кантроль тэрыторыі, добраахвотнасць удзелу ў вайскова-палітычных альянсах і бяспечную інфармацыйную прастору, замест чаго ў Беларусі прысутнічаюць замежныя войскі, магчыма размяшчэнне ядзернай зброі, а таксама безкантрольнае ўздзеянне расійскай прапаганды;

Канстатуючы, што ўдзел Беларусі ў АДКБ, Саюзнай дзяржаве з Расіяй і іншых прамаскоўскіх утварэннях з'яўляецца пагрозай для краіны, а не гарантам яе бяспекі;

Прымаючы пад увагу шматлікія рызыкі у сферы не толькі канвенцыйнай бяспекі, але таксама бяспекі інфармацыйнай, культурнай, эканамічнай, міграцыйнай, энэргетычнай і моладзевай, прааналізаваныя ў "Red Paper: EU–Belarus Security Framework 2025"[2];

***Мы, дэмакратычныя сілы Беларусі,***

Пацвярджаем, што галоўная мэта бяспекі Беларусі – аднаўленне і забеспячэнне поўнага ваеннага, палітычнага і інфармацыйнага суверэнітэту краіны на аснове дэмакратыі, вяршэнства права і мірных адносін з суседзямі.

Выступаем за:

— вывад замежных войскаў і недапушчальнасць размяшчэння ядзернай зброі на тэрыторыі Беларусі;

1 https://t.me/rada_vision/4084

2 https://tsikhanouskaya.org/en/news/red-paper-what-needs-to-be-known-about-belarus-here-and-now.html

— выхад Беларусі з АДКБ і Саюзнай дзяржавы з выкананнем усіх працэдураў;
— перагляд ваеннай дактрыны з фокусам на абарону міжнародна прызнанай тэрыторыі Беларусі і мірную знешнюю палітыку;
— дэмантаж прапагандысцкіх сетак і іншыя захады ў падтрымку інфармацыйнай бяспекі, у тым ліку падтрымку незалежных СМІ;
— поўнае вяртанне Беларусі ў міжнародна-прававое поле і ўключэнне ў еўрапейскую сістэму калектыўнай бяспекі па факце выканання унутранніх зменаў для адпаведнасці крытэрам партнёрскіх краін.

Папярэджваем, што далейшая залежнасць ад Расіі нясе пагрозу страты дзяржаўнасці і паглыблення міжнароднай ізаляцыі.

Заклікаем міжнародную супольнасць падтрымліваць пазіцыю дэмакратычных сіл Беларусі як легітымных прадстаўнікоў беларускага народа і прызнаваць грамадзян Беларусі не як саўдзельнікаў, а як ахвяр геапалітычнай агрэсіі Расіі.

Заклікаем міжнародную супольнасць:

— падтрымліваць працу дэмакратычнай супольнасці над бяспечнымі сцэнарамі пераходу да дэмакратыі;
— аказваць уплыў на рэжымы ў Мінску і Маскве з мэтай выхаду Беларусі з вайскова-палітычнай арбіты Расіі;
— прыняць да ўвагі і ўключыць у сваю працу рэкамендацыі, выпрацаваныя экспертамі ў “Red Paper: EU–Belarus Security Framework 2025”, кіравацца імі пры распрацоўке падыходаў і палітык па бяспеке адносна Беларусі;
— вызначыць магчымыя фарматы ўдзелу Беларусі ў рэгіянальных бяспекавых платформах.

Лічым неабходным:

— распрацаваць новую архітэктуру бяспекі Беларусі з гарантыямі грамадзянскага кантролю над сілавымі структурамі;
— юрыдычна замацаваць забарону на размяшчэнне замежных вайсковых аб’ектаў на тэрыторыі Беларусі без народнага мандата.

Заклікаем усе беларускія і міжнародныя дэмакратычныя сілы аб’яднаць высілкі дзеля:
— распрацоўкі дарожнай мапы бяспечнага выхаду з гібрыднай акупацыі;
— пераходу да дэмакратыі;

— стварэння мірнай і еўрапейскай Беларусі, якая гарантуе бяспеку не толькі сваім грамадзянам, але і ўсяму рэгіёну.

Выказваем удзячнасць прадстаўніцтвам дэмакратычнага руху, а таксама партнерскім краінам, якія ўжо падтрымліваюць нашу мэту зрабіць Беларусь бяспечнай, дэмакратычнай і незалежнай.

Перакананыя, што Беларусь можа быць бяспечнай толькі ў рэгіянальнай і еўрапейскай сістэме бяспекі, з дэмакратычнымі інстытутамі, каб судзейнічаць бяспеке ў рэгіёне.

*Жнівень 2025*